# КАФЕДРА ЭТНАЛОГІІ, МУЗЕЯЛОГІІ І ГІСТОРЫІ МАСТАЦТВАЎ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ: ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ ЭТНАГРАФІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ (2016–2021 гг.)

***І. Г. Бачыла***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030 г. Мінск, Беларусь,* bochilka@yandex. ru

Артыкул прысвечаны аналізу дзейнасці кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ у галіне правядзення палявых этнаграфічных даследаванняў (2016–2021 гг.). Аўтар характарызуе актуальнасць, методыку і тэматыку экспедыцыйнай працы, раскрывае яе геаграфію, пазначае асноўныя вынікі працы ў «полі».

***Ключавыя словы:*** этналогія; палявыя этнаграфічныя даследаванні; экспедыцыя; кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў; Беларусь.

# КАФЕДРА ЭТНОЛОГИИ, МУЗЕОЛОГИИ И ИСТОРИИ ИСКУССТВ ИСТОРИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА БГУ: РЕЗУЛЬТАТЫ ПОЛЕВЫХ ЭТНОГРАФИЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЙ (2016–2021 гг.)

***И. Г. Бочило***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030 г. Минск, Беларусь,* bochilka@yandex. ru

Статья посвящена анализу деятельности кафедры этнологии, музеологии и истории искусств БГУ в области полевых этнографических исследований (2016–2021 гг.). Автор характеризует актуальность, методику и тематику экспедиционной работы, раскрывает её географию, указывает основные результаты работы в «поле».

***Ключевые слова:*** этнология; полевые этнографические исследования; экспедиция; кафедра этнологии, музеологии и истории искусств; Беларусь.

# THE DEPARTMENT OF ETHNOLOGY, MUSEOLOGY AND HISTORY OF ARTS OF THE HISTORICAL FACULTY OF BSU: AN EXPERIENCE OF ETHNOGRAPHIC RESEARCH IN THE «FIELD» (2016–2021)

***I. G. Bachyla***

*Belarusian State University, Independence Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: I. G. Bachyla (*bochilka@yandex. ru*)*

The article is devoted to the activities of the department of ethnology, museology and history of arts in conducting ethnographic research in the «field». The author describes the relevance, technique and them of the expeditionary work, reveals its geography, basic results of the work.

***Key words:*** ethnology; the ethnographic research in the «field»; expedition; department of ethnology, museology and history of arts; Belarus.

Адным з асноўных метадаў вывучэння культуры этнасаў з'яўляюцца палявыя даследаванні. Гэты метад стаў шырока практыкавацца з сярэдзіны XIX ст. Не згубіў ён сваёй актуальнасці і на сучасным этапе. Выкарыстанне ў навуковых этналагічных працах палявых матэрыялаў, сабраных даследчыкам асабіста, істотна павышае навуковую значнасць яго работ. Авалодванне навыкамі палявых даследаванняў з'яўляецца неад'емнай часткай працэсу падрыхтоўкі прафесійных этнолагаў [1, с. 62].

З самага пачатку існавання кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў (2001 г.) яе выкладчыкі рэгулярна ладзяць палявыя этнаграфічныя даследаванні ва ўсіх гістарычна-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі. Правядзенню кожнай экспедыцыі папярэднічае змястоўная і карпатлівая падрыхтоўчая праца. Яна складаецца з двух этапаў. Першы – навуковая падрыхтоўка, другі – матэрыяльнае забеспячэнне экспедыцыі. У межах навуковай падрыхтоўкі высвятляецца, што ўжо вядома па абранай тэме (тэмах) экспедыцыі, вызначаюцца мэты і задачы будучай палявой працы. Для гэтага вывучаецца спецыяльная літаратура, праводзіцца праца з музейнымі прадметамі. Асобная ўвага звяртаецца на геаграфію і лагістычныя магчымасці рэгіёна, у якім будуць праводзіцца даследаванні. Навуковая падрыхтоўка экспедыцыі завяршаецца складаннем яе праграмы і апытальнікаў.

Падчас палявых этнаграфічных даследаванняў іх удзельнікамі выконваюцца розныя віды работ: асабістае назіранне, апытанне мясцовых жыхароў, збор этнаграфічных прадметаў, фотафіксацыя вынікаў назірання, апрацоўка сабранага матэрыяла, яго расшыфроўка і набор, складанне легенд для кожнага сабранага прадмета.

Летняя экспедыцыя 2016 г. ладзілася на тэрыторыі Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Базай яе правядзення стала вёска Мсціж, якая знаходзіцца непадалёк ад Віцебскай вобласці і мае багатую гісторыю. Першае ўпамінанне пра Мсціж адносіцца да XIV ст. У розныя часы маёнтак знаходзіўся ва ўласнасці Радзівілаў, Тышкевічаў, Сапег, Храптовічаў, і нарэшце Слізняў, якія з другой паловы XVIII ст. сталі адзінымі ўладальнікамі маёнтка. Менавіта яны адбудавалі тут дваранскую сядзібу, рэшткі якой захаваліся да нашага часу. Даследаванні праводзіліся не толькі ў самой вёсцы Мсціж, але і ў бліжэйшых населеных пунктах (в. Мрай, Волакі, Макаўе, Халмоўка, Загор'е, Гаражанка, Собалеўка, Ніўкі, Броды, пасёлак імя Вароўскага). За перыяд працы ў Мсціжскім краі было апытана больш за 50 інфармантаў. Сабраны матэрыял прадстаўлены на 288 старонках, зроблена больш за 150 фотаздымкаў. Этнаграфічныя

экспанаты, сярод якіх сталярныя інструменты, ручнікі, ночвы, былі перададзены ў дар Мсціжскай сярэдняй школе. Каштоўным экспанатам, знойдзеным падчас дадзенай экспедыцыі, стаў праваслаўны абраз, атрыманы ад мясцовай пажылой жыхаркі. Яго па завяршэнні палявых даследаванняў супрацоўнікі кафедры перадалі для правядзення атрыбуцыі і далейшага захавання ў Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусі.

Стогадоваму юбілею вывучэння вічынскіх палян вядомым этнографам І. А. Сербавым была прысвечана экспедыцыя 2017 г. [4]. Матэрыялы па зменах і трансфармацыі традыцыйнай культуры мясцовых жыхароў збіраліся ў вёсках Вічын, Дварэц, Дрэбск, Яжаўкі, Язвінкі, Сасноўка, Кажан-Гарадок Лунінецкага раёна. Падчас экспедыцыі было зроблена некалькі сотняў фотаздымкаў і набыта звыш 50 этнаграфічных прадметаў. Сярод іх вышываныя ручнікі, элементы традыцыйнага жаночага касцюмнага комплексу, керамічныя вырабы, керасінавая лямпа, маслабойка, прас, кафямолка даваеннага часу. Сабраны і апрацаваны матэрыял агульным аб’ёмам 342 старонкі.

Летам 2018 г. палявыя этнаграфічныя даследаванні былі арганізаваны на тэрыторыі Лідчыны (Гродзенская вобл.). Базай правядзення трохтыднёвай экспедыцыі стала Ваверская сярэдняя школа, дзе размясцілася група кіраўнікоў і практыкантаў. Акрамя самой вёскі Ваверка, аб’ектам даследавання сталі ў тым ліку бліжэйшыя населеныя пункты. Сярод іх – в. Кавалі, Красноўцы, Паперня, Чаплі, Серафіны, Альхоўка, Мейры і інш. У ходзе даследаванняў было апытана больш за 50 інфармантаў. Сабраны матэрыял прадстаўлены ў аўдыяфармаце, а таксама на 320 старонках рэдактара Word. Фотакалекцыя лідскай экспедыцыі налічвае звыш 150 здымкаў, а выяўленыя этнаграфічныя прадметы перададзены музею Ваверскай сярэдняй школы.

Летам 2019 г. чарговая экспедыцыя зноў ладзілася на Гродзеншчыне, а менавіта ў Зэльвенскім раёне. На працягу трох тыдняў па спецыяльна падрыхтаваных апытальніках праводзіўся збор палявога этнаграфічнага матэрыялу па асаблівасцях традыцыйнай культуры мясцовых жыхароў. Было апытана звыш 80 жыхароў Зэльвы, Дзярэчына, Міжэрыч, а таксама навакольных вёсак – Сынкавічы, Дзергілі, Шэйкі, Клепачы, Задвор’е, Тулава і інш. [2, с. 415].

Гродзенская вобласць – рэгіён канфесійна разнастайны з традыцыйна высокім узроўнем рэлігійнасці насельніцтва. Зэльвеншчына не выключэнне. Раён адносіцца да праваслаўна-каталіцкага. Аб талерантнасці

і паразуменні паміж вернікамі сведчаць шматлікія факты. Так, міжэрыцкія касцёл і царква наўмысна былі адбудаваны адной вышыні, каб падкрэсліць раўнапраўе абодвух канфесій. Досыць пашыранымі ў гэтай мясцовасці з’яўляюцца шлюбы паміж каталікамі і праваслаўнымі: «Сама я полька, а муж у мяне праваслаўны. Мы вянчаліся ў цэркві… Я хажу ў цэркаў, там хажу да іспаведзі. А ў касцел хажу абязацельно адзін раз втарого наябра» (запісана 18. 07. 2019 у в. Дзярэчын ад Маляўскай Г. П. 1947 г. н.). Нярэдка, па сведчаннях інфармантаў, і дзяцей хрысцілі ў тым храме, які меўся паблізу: каталікі маглі хрысціць немаўлят у царкве, а праваслаўныя адпаведна ў касцёле.

Значны след у гісторыі Зэльвенскага раёна пакінула антырэлігійная савецкая кампанія, у межах якой адбывалася закрыццё мясцовых культавых збудаванняў. Часта такія захады самі ўлады тлумачылі нездавальняючым (аварыйным) станам адпаведных аб’ектаў, у шэрагу выпадкаў дзяржава перашкаджала іх рамонту. Многія касцёлы і цэрквы сталі выкарыстоўвацца не па прамому прызначэнню і прыходзілі яшчэ ў больш нядбайны стан. Так, Сынкавіцкая царква, унікальны архітэктурны аб’ект Беларусі, у 1960 г. па ініцыятыве камсамольцаў-калгаснікаў быў перададзены пад спартклуб. Частка культавых збудаванняў выкарыстоўвалася калгасамі пад гаспадарчыя патрэбы, прычым нярэдка з нязнятымі крыжамі і з захаваннем у памяшканнях рэлігійных атрыбутаў і начыння.

Напрыканцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. традыцыйныя для Зэльвеншчыны рэлігіі (праваслаўе і каталіцызм) пачалі адраджацца. Назіралася сацыяльная патрэба ў аднаўленні старых і будаўніцтве новых аб’ектаў рэлігійнай інфраструктуры.

Важнай характарыстыкай канфесійнай сітуацыі на Зэльвеншчыне з'яўляецца сацыяльная значнасць дзейнасці служыцеляў культу ў распаўсюджванні і падтрыманні рэлігійнага светапогляду сярод мясцовых жыхароў. У пераважнай колькасці інтэрв’ю, праведзеных у в. Міжэрычы і яе ваколіцах, інфармантамі прыгадваецца асоба ксяндза Томаша Каліньскага: «Ксендз, я не вядаю, зкуль ён, Томаш Калінскі, я сёння помню… Ён вялікі, здаровы, высокі такі быў. Мы яго сустрачаем, у суботу у нас рэлігія пасследні урок быў і мы ўжо бяжым да яго руку цэлуем, бо да ксендза трэбо, бо недзі бэндза пахваленны, а ён: «Ой, асталопы, асталопы”. Пагладзіць такі па галаве, інцерэсна было. І мы все любілі яго, шкадавалі, наша парафія» (запісана 19. 07. 2019 у в. Задвор’е ад Ляцкай Г. Ю. 1928 г. н.). Не меншай павагай сярод мясцовых вернікаў карыстаецца

айцец Ян Банькоўскі. З дваццаці гадоў ён працаваў у міжэрыцкім каталіцкім прыходзе, шмат карыснага зрабіў для касцёла і для развіцця каталіцкай веры. На сённяшні дзень пры шэрагу цэркваў і касцёлаў на Зэльвешчыне дзейнічаюць міні-музеі, прысвечаныя развіццю рэлігійнай сітуацыі на гэтых землях у розныя часы. Удзельнікі экспедыцыі ў межах спецыяльных экскурсій, праведзеных мясцовымі святарамі, наведалі такія музеі ў в. Міжэрычы (пры мясцовым касцёле і пры царкве), а таксама ў самой Зэльве (на тэрыторыі Троіцкай царквы).

Для значнай часткі сталага насельніцтва асобных вёсак Зэльвеншчыны існуе праблема транспартнай даступнасці рэлігійных аб’ектаў. Для гэтага раёну характэрна зніжэнне аб’ёмаў фізічнай мабільнасці насельніцтва ў сувязі з дэмаграфічнай дэпапуляцыяй, старэннем жыхароў.

Культура жыццезабеспячэння насельніцтва Зэльвеншчыны залежала ад шэрагу фактараў, сярод якіх можна адзначыць спецыялізацыю мясцовай гаспадаркі і выпрацаваную этнічную традыцыю. Асноўным прадуктам харчавання быў печаны жытні хлеб. На святы пяклі пірагі з пшанічнай мукі. Пашырана было піва, якое тут варылі з цукровых буракоў.

У гэтым рэгіёне да сёняшняга дня добра захаваліся шматлікія архаічныя формы і элементы традыцыйнай сацыяльнай культуры. Яскравым прыкладам з’яўляецца знакаміты Ганненскі кірмаш. Фактычна гэта было месца сустрэч людзей, заключэння дамоў, абвяшчэння падзей. Ярмарка была не толькі сродкам камунікацыі і эканамічных адносін, яна выконвала функцыі культурнага цэнтра: тут былі арганізаваны продаж кніг, выступленні тэатральных труп. Гэтыя традыцыі захоўваюцца мясцовымі ўладамі і сёння.

Сабраны ў межах зэльвенскай экспедыцыі матэрыял падрыхтаваны да друку. Ён паслужыць важнай крыніцай для рэгіянальных даследаванняў, а таксама можа быць выкарыстаны для распрацоўкі турыстычных маршрутаў Зэльвеншчыны [3].

Эпідэміялагічная сітуацыя, якая ўсталявалася ў краіне і свеце ў 2020 г., унесла свае карэктывы ў правядзенне палявой работы кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў. Два гады запар (2020 і 2021 г.) каардынацыйнай базай для ўдзельнікаў даследаванняў стала электронная платформа eduhist. bsu. by. Студэнты і выкладчыкі, знаходзячыся па месцы свайго пражывання, выконвалі наступныя віды работ: асабістае назіранне, гутаркі з мясцовымі жыхарамі, фіксацыя вынікаў назірання з дапамогай

фотаздымкі, апрацоўка сабранага матэрыялу, яго расшыфроўка і набор. Збор палявога матэрыялу ажыццяўляўся па загадзя падрыхтаваных апытальніках. Матэрыялы інтэрв'ю і фота праходзілі дадатковую праверку і былі сабраны ў межах асобных тэматычных блокаў на пляцоўцы eduhist. bsu. by.

Такім чынам, праца ў «полі» па-ранейшаму застаецца надзвычай важнай і запатрабаванай часткай этналагічных даследаванняў. Этнолагі кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ плённа працуюць на ніве падрыхтоўкі спецыялістаў, якія грунтоўна валодаюць навыкамі палявой работы і асабіста прымаюць актыўны ўдзел у зборы адпаведных матэрыялаў.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Бачыла І. Г. Кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ: вопыт палявых этнаграфічных даследаванняў // Туризм и гостеприимство: научно-практический журнал. 2018. №1. С. 62–66.
2. Бачыла І. Г., Алюніна І. У., Навагродскі Т. А. Вынікі этнаграфічнай экспедыцыі гістарычнага факультэта БДУ ў Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: зб. навук. арт. 2021. Вып. 2. С. 415–419.
3. Ковалевич Т. Студенты БГУ изучают культурные традиции Зельвенщины // Газета «Праца». Зельва. 2019. Точка доступа: https://zelwa. by/studenty-bgu-izuchayut-kulturnye-tradicii-zelvenshhiny/
4. Сербаў І. А. Вічынскія паляне: матэрыяльная культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся. Мінск: БФК, 2005.